# 2023 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

*Звесткі з архіва Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі*

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з'яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2023 год з'яўляецца юбілейным.*

**Караткевіч, У. Каласы пад сярпом тваім : раман: [у 2 кн.] / Уладзімір Караткевіч. – Мінск : Беларусь, 1968.**

55 гадоў






# «Каласы пад сярпом тваім» : 55 гадоў

«Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча (1930–1984) – адзін з найбольш значных для беларускай літаратуры твораў.

Спачатку друкаваўся ў 1965 годзе ў №№ 2–6 часопіса «Полымя». Асобным выданнем раман выйшаў у свет у 1968 годзе ў выдавецтве «Беларусь» тыражом 10 000 экзэмпляраў. Кніга першая пад назвай «Выйсце крыніц» у набор была здадзена 09.01.1968, да друку падпісана 25.09.1968. Кніга другая, «Сякера пры дрэве», у набор здадзена 05.03.1968, а да друку падпісана 26.09.1968.

Кнігі мелі цвёрды пераплёт і супервокладкі. Мастацкае афармленне гэтага выдання належыць вядомаму мастаку-графіку Арлену Кашкурэвічу (1929–2013).



# «Каласы пад сярпом тваім» : 55 гадоў

Падзеі рамана «Каласы пад сярпом тваім» адносяцца да 1850–1861 гг., але праз рэтраспекцыі ахопліваецца і больш далёкі час. Дзеянні адбываюцца на Магілёўшчыне, у мястэчку Свіслач, што ў Гродзенскай вобласці, у Пецярбургу, Маскве, Варшаве. У творы дзейнічаюць выдуманыя персанажы — дваране Алесь Загорскі, яго бацька Юры і дзед Даніла Загорскі-Вежа, Яраш, Раўбіч, Надзея Клейна, Корчак, Чорны Война і іншыя. Але ў тэкст таксама ўведзены і рэальныя гістарычныя асобы. Гэта Кастусь і Віктар Каліноўскія, Зыгмунд Серакоўскі, Station Станіслаў Манюшка, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Уладзімір Сыракомля, Тарас Шаўчэнка і іншыя.

У першай кнізе «Выйсце крыніц» апісваецца маленства і юнацтва будучых герояў паўстання 1863–1864 гг., малююцца іх душэўныя памкненні і мары, свет іх кахання і сяброўства. У кнізе другой рамана чытач знаёміцца з грамадска-палітычнай абстаноўкай у Беларусі напярэдадні паўстання 1863–1864 гг., раскрываецца складанасць умоў, у якіх раслі і гартаваліся паўстанцкія сілы, выспявала народнае нездавальненне існуючым ладам.

У рамане сцвярджаецца думка, што ў асяроддзі шляхты былі асобы, якія імкнуліся палепшыць грамадскае і сацыяльнае жыццё ў Беларусі, наблізіць яго да еўрапейскага ўзроўню, што інтарэсы і памкненні беларускага дваранства і сялян у многім супадалі. Па прызнанні У. Калесніка, «Караткевіч марыў адрадзіць арыстакратызм, элітарнасць у ахамелым на таталітарнай ураўнілаўцы грамадстве. Арыстакраты ў яго не абібокі, а рабачаі духу, соль зямлі, патрыёты, ахвярнікі, краса жыцця... Нобілі ў яго разуменні — гэта людзі гонару».

Персанажы У. Караткевіча не хочуць быць «вінцікамі» вялікага дзяржаўнага механізма. Гэта асобы, якія не дазваляюць маніпуляваць сабою і робяць тое, што хочуць і лічаць патрэбным рабіць. Яны ці то актыўна ўключаюцца ў грамадскі працэс, ці выходзяць з яго зусім, калі гэта не адпавядае іхнім уяўленням пра чалавечую годнасць. Адны з іх гінуць, як Акім Загорскі, другія становяцца ў пасіўную апазіцыю, як стары Вежа. Галоўны герой, Алесь Загорскі, абраў іншы шлях. Яго выбар ухвалены і падтрыманы сваякамі — бацькамі, братамі і дзедам.

# «Каласы пад сярпом тваім» : 55 гадоў

«У 1960-я г., калі ствараўся раман, асабліва наспела патрэба ў адкрытай размове дарослага чалавека з юнаком, і Караткевіч гэта адчуваў. Хрушчоўская адліга, якая пачалася ў сярэдзіне 1950-х г., імкліва стала змяняцца новымі «замаразкамі», што згубна паўплывала на духоўны свет чалавека. Большасць суайчыннікаў той пары былі  пазбаўлены пачуцця чалавечай годнасці, высакародства. Хоць у гэты перыяд за вернасць праўдзе, за адсутнасць страху перад начальствам нельга было трапіць у Сібір, ці паплаціцца жыццём, аднак няміласць кіраўнікоў розных рангаў многае значыла ў той час.
Караткевіч, як мог, супрацьстаяў сіле, скіраванай супраць знявагі чалавечай годнасці. Аўтарскім запаветам юным усіх часоў гучаць словы Вежы, героя рамана «Каласы пад сярпом тваім»: «Пагоны, ордэны, прывілеі разбэсцілі амаль усіх. Гэта подласць. Гэта замаскіраваныя хабары, якімі бяруць прагных да пашаны і проста нячыстых людзей. І вось таму я кажу табе гэта, каб ты не быў падобны да іх. Ніколі не бяры прынады, ніколі не бяры славы і ўлады — хаця б цябе сілком цягнулі да іх. Ніколі не йдзі на раду нечасцівых…». Пісьменнік рабіў усё дзеля таго, каб у сваіх гістарычных творах паказаць маладому чалавеку, «які стаіць перад выбарам, кім яму быць», жыццёвы ідэал, варты пераймання».

Г. М. Ішчанка

# «Каласы пад сярпом тваім» : 55 гадоў

**Цытаты з рамана:**

●«Забяры ў чалавека ў адзін дзень сваякоў, хлеб, волю, мову. Ён жа ўзбунтуецца. Ён зброю возьме. А тут цісНуць патроху, па каліву, па слоўцу, па чалавеку, па песні — непрыкметна адбіраюць».

●«Душа твая належыць толькі Богу і гэтым палям, шабля — ваяводзе справядлівай вайны, жыццё — усім добрым людзям, сэрца — каханай. Але гонар і чэсць — яны належаць толькі табе і больш нікому».

●«Справядлівасць чалавек павінен адчуваць сэрцам, а не законамі».

●«Кожны падлец калі-небудзь рабіў першы крок да подласці».

●«Мы патрыёты больш за вас. Але мы не хочам велічы за кошт іншых народаў. Бо ўсе людзі зямлі — браты. І ўсе яны падобны адзін на аднаго і на нас. На свеце няма горшых народаў…».

●«Сям'я, дзе трымаюцца старых звычаяў, не можа выхаваць юду».

●«Заручыны — гэта яшчэ не вяселле. І нават вяселле яшчэ не канец. Разумееш, на зямлі існуе адзіная непапраўнанасць, адзіная незваротнасць. Гэта смерць. Пакуль яна не прыйшла — усе можна змяніць тваёй воляй або капрызам лёсу».

●«Звычайна ў людзей так. Першае — гэта я, другое — сям'я, родны дом, трэцяе — родны горад, чацвёртае — родная краіна, пятае — родная Зямля, роднае Чалавецтва. І кожны любіць сябе, амаль усе — сям'ю, большасць — родны горад, частка — радзіму. І толькі адзінкі любяць чалавецтва. Па сапраўднаму, а не на словах…».

# «Каласы пад сярпом тваім» : 55 гадоў

Як задумваўся раман, сам Уладзімір Караткевіч расказаў у аўтабіяграфічным нарысе «Дарога, якую я прайшоў»: «Пасля заканчэння ўніверсітэта я здаў кандыдацкі мінімум і пачаў быў пісаць дысертацыю пра паўстанне 1863 г. ва ўсходнеславянскіх і польскай літаратурах, але прыйшлі іншыя інтарэсы: з’явілася задумка аб рамане на тую самую тэму. Да рэалізацыі яе, праўда, я прыступіў толькі праз дванаццаць год».
Як сцвярджаюць даследчыкі, у адной з запісных кніжак Караткевіча пазначана, што пачатак рамана «Каласы пад сярпом тваім» нарадзіўся 7 жніўня 1959 года ля Азярышча на Рагачоўшчыне, дзе на высокім правым беразе Дняпра пісьменнік убачыў грушу. У той жа час у найбольш поўным на сёння выданні рамана запісана іншая дата – 27 красавіка 1962 года. Пры гэтым дакладна вядома, калі была завершана праца над першай кнігай, таму што ў канцы рукапісу аўтар зрабіў запіс: «Канец першай кнігі. 18 мая 1964 г. 23.47».


Уладзімір Караткевіч
Малая аўтабіяграфія.
(Дарога, якую прайшоў)

У. Караткевіч. “Дарога, якую прайшоў”.
Аўтабіяграфія (урывак).
1964 г. Аўтограф У. Караткевіча.
Фота с сайта «Архівы Беларусі»

# «Каласы пад сярпом тваім» : 55 гадоў

**Цікавыя факты аб рамане**:

●У лютаўскім-чэрвеньскім нумарах 1965 года часопіса «Полымя» раман «Каласы пад сярпом тваім» друкаваўся ў надта скарочаным і змененым, у параўнанні з рукапісам, выглядзе. Правіў тэкст галоўны рэдактар «Полымя» Максім Танк.

●Сёння раман «Каласы пад сярпом тваім» — адзін з самых чытаных раманаў беларускай літаратуры. Але шлях твора да чытача быў няпросты. Вырашэнне пытання аб мэтазгоднасці яго выдання ў дзяржаўным выдавецтве «Беларусь» ставілася пад сумненне і ператварылася ў бурную палеміку паміж літарататарамі. Максім Лужанін напісаў адмоўную рэцэнзію на 75 старонках машынапіснага тэксту. Рэцэнзент (а за ім і іншыя крытыкі) фактычна прапаноўвалі змяніць канцэпцыю рамана, зрабіўшы ў ім рухаючай сілай паўстання не шляхту, а сялянства, і звязаць падрыхтоўку паўстання з рускім рэвалюцыйным рухам. Караткевіч катэгарычна адмовіўся  гэта рабіць і, змагаючыся за свой твор, парасіў правесці абмеркаванне рамана ў Саюзе пісьменнікаў БССР, якое і адбылося 22 лютага 1967 года. Старшынёй гэтага пасяджэння быў Іван Мележ.

● Прадзед У. Караткевіча з боку маці — Тамаш Грыневіч — удзельнічаў у паўстанні 1863–1864 гг., камандаваў атрадам паўстанцаў, які дзейнічаў на Магілёўшчыне. Атрад быў разбіты, а прадзед расстраляны.

●Раман «Каласы пад сярпом тваім» — адзіная кніга, якая была надрукавана ў Беларусі шрыфтам Брайля.

# «Каласы пад сярпом тваім» : 55 гадоў

**Перавыданні рамана «Каласы пад сярпом тваім»:**

1981 г. – раман выйшаў дзвюма кнігамі тыражом 35 000 экзэмпляраў у выдавецтве «Юнацтва». Прадмова, пасляслоўе і заўвагі ў выданні зроблены Яўгенам Гарадніцкім;

1995 г. – выданне дзвюх кніг рамана, ажыццёўленае у выдавецтве «Юнацтва» тыражом 20 000 экзэмпляраў;

1998 г. – аднатомнае выданне дзвюх кніг, ажыццёўленае ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» тыражом 4 000 экзэмпляраў;

2001 г. – аднатомнае выданне дзвюх кніг, ажыццёўленае ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» тыражом 7 000 экзэмпляраў;

2002 г. – выданне дзвюх кніг рамана, ажыццёўленае у выдавецтве «Ураджай» тыражом 9 622 экзэмпляры. Выданне суправаджаецца артыкулам, падрыхтаваным доктарам філалагічных навук Генадзем Кісялёвым. Каментатарам пісьмовага тэксту з’яўляецца А. Л. Верабей;

2007 і 2008 гг. – аднатомныя выданні дзвюх кніг, ажыццёўленыя ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» тыражом 3 000 экзэмпляраў кожнае;

2017, 2018 і 2021 гг. – аднатомныя выданні дзвюх кніг, ажыццёўленыя ў выдавецтве «Папуры» тыражом 2 500 экзэмпляраў кожнае;

2022 г. – аднатомнае выданне дзвюх кніг, ажыццёўленая ў выдавецтве «Папуры» тыражом 3 100 экзэмпляраў.